Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ: НОВАЕ Ў ДАСЛЕДАВАННІ І ВЫКЛАДАННІ

*Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі*

27 сакавіка 1999 года

Частка 1

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Мінск 1999

беларусаў і імкненню да кансалідацыі беларускай нацыі ў адзінай дзяржаве. Аб'яднанне Заходняй Беларусі з БССР адбылося ў 1939 г.

**М. М. Сакалоў**

## НОВАЕ Ў ГІСТАРЫЯГРАФІІ НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСІ Ў 1920—1930 гг.

Развіцце народнай адукацыі на Беларусі ў 1920—1930 гг. не выпадкова трывала прыцягвае ўвагу айчынных даследчыкаў. Абумоўлена гэта тым, што менавіта ў той час была створана разгалінаваная сістэма навучальных установ, адбывалася яе паступовая мадыфікацыя, ішоў працэс пошукаў аптымальных формаў навучання, была закладзена матэрыяльная база, дасягнуты значныя зрухі ў агульна-адукацыйным узроўні насельніцтва, пакладзены пачатак падрыхтоўкі кадраў спецыялістаў.

У пасляваенны час беларускімі навукоўцамі створаны шэраг фундаментальных прац [1], якія даюць уяўленне аб маштабах змен, адбываўшыхся ў культурнай і адукацыйнай сферах. На падставе шырокага статыстычнага матэрыяла ў іх зроблена спроба прааналізаваць асноўныя напрамкі палітыкі савецкай улады ў галіне адукацыі, асвятляюцца практычныя мерапрыемствы дзяржаўных установ і органаў кампартыі па развіццю агульнай, спецыяльнай і вышэйшай адукацыі. У сваей сукупнасці яны з'яўляюцца пэўным дасягненнем беларускай гістарычнай навукі, даюць падставы сцвярджаць, што названая праблема займае належнае месца ў беларускай гісторыяграфіі. Разам з тым ім уласцівы і недахопы, абумоўленыя агульным станам развіцця гістарычнай навукі: ідэалагізаваны падыход да высвятлення сутнасці палітыкі кампартыі ў сферы адукацыі, класавы падыход як адзіны верны пры аналізу адбываўшыхся змен у сістэме падрыхтоўкі кадраў, абмежаванасць, а часам і тэндэнцыйны падбор фактаў, статыстычных дадзеных.

Таму і ў апошняе дзесяцігоддзе з'явіліся навуковыя працы, якія працягваюць вывучэнне асобных праблем і працэсаў у сферы адукацыі на Беларусі ў 20-я — 30-я гг.; назіраецца імкненне пераасэнсаваць раней вядомыя факты і з'явы, больш крытычна і аб'ектыўна падыйсці да вывучэння ацэнак. Падставай для гэтага з'яўляюцца, па-першае, магчымасць доступу да раней закрытых фондаў архіваў, першакрыніц і літаратуры; па-другое, незадаволенасць ідэалагізаванымі стэрыятыпамі, якія склаліся ў папярэдні час пры вывучэнні праблемы; па-трэцяе, павялічэнне увагі да малавывучаных бакоў развіцця асветы ў 20-я — 30-я гг., такіх як



беларусізацыя, ажыццяўленне нацыянальнай палітыкі і інш. Менавіта гэта і адрознівае сучасную гісторыяграфію гісторыі народнай адукацыі на Беларусі ў 1920—1930 гг.

Адметнай з'явай у распрацоўцы праблемы сталі працы Е. Андрэявай, Т. Баталкі, А. Бендзіна, Л. Лыча, У. Тугая і інш. даследчыкаў, якія прысвечаны ажыццяўленню палітыкі беларусізацыі ў сферы адукацыі [2]. Беларусізацыя як палітыка нацыянальна-культурнага адраджэння здолела праявіць сябе перш за ўсе менавіта ў агульнаадукацыйнай школе, прывяла да адметных зрухаў у вышэйшай адукацыі. На падставе архіўных крыніц у артыкулах Л. Лыча, У. Тугая і інш. паказана, як распрацоўвалася школьная палітыка ў напрамку беларусізацыі, да якіх якасных змен у галіне адукацыі яна прывяла. Адзначым, што ў ранейшых даследаваннях беларусізацыя як напрамак развіцця школьніцтва ў 20-я гг. амаль нават не ўспаміналася.

Адметнай рысай даследаванняў апошняга дзесяцігоддзя стала ўвага навукоўцаў да нацыянальнага аспекту ў сферы адукацыі ў 20-я — 30-я гг. Сведчаннем гэтага з'яўляецца кандыдатская дысертацыя А. М. Вабішчэвіча «Нацыянальная школа ў Заходняй Беларусі: стан, праблемы захавання (1921—1939 г.)» (Мінск, 1996). На падставе вывучэння новых архіўных дакументаў, іх комплекснага аналізу даследавана палітыка польскіх улад у галіне адукацыі, якая нават пры недастатковай задаволеннасці адукацыйных патрэб насельніцтва на заходнебеларускіх землях была накіравана на знішчэнне беларускай нацыянальнай школы, на пераўтварэнне адукацыйнай сістэмы ў дзейны фактар асіміляцыі беларускага насельніцтва.

Пытанні народнай адукацыі ўсе цясней звязваюцца з праблемамі становішча нацыянальных меншасцей на тэрыторыі Савецкай Беларусі ў 20-я — 30-я гг. У шэрагу артыкулаў С. Яцкевіча [3] даследуецца агульнаадукацыйная палітыка адносна патрэб нацменшасцей, высвятляецца стан яўрэйскіх, польскіх, рускіх, латышскіх, украінскіх і іншых нацыянальных школ. Робіцца абгрунтаваная выснова, што ў БССР былі створаны ў цэлым спрыяльныя ўмовы для развіцця адукацыі некарэнных народаў. Асобныя праблемы названай тэмы даследуюцца таксама І. Герасімавай, Э. Дубяніцкім, І. Пушкіным, Л. Шкуцько і інш. [4].

Новыя падыходы да асэнсавання і больш аб'ектыўнай ацэнкі складаных працэсаў, якія адбываліся ў вышэйшай школе БССР у 20-я — 30-я гг., прымлівае дысертацыйнае даследаванне М. Еўдакіменкі [5]. Прынцыпова новым ў ім з'яўляецца крытычны аналіз уплыву супярэчнасцей грамадска-палітычнага характара, якія былі ўласцівы азначанаму перыяду, на працэс станаўлення і функцыяніравання сістэмы вышэйшай адукацыі ў рэспубліцы. Аўтар упершыню крытычна ставіцца да вынікаў панаваўшага ў 20-я гг.

класавага прынцыпа пры камплектаванні складу студэнтаў і выкладчыкаў, асвятляе шматлікія праблемы вышэйшай школы ў цеснай сувязі з маральна-палітычным кліматам, што складваўся ў беларускім савецкім грамадстве.

Агляд сучаснай гісторыяграфіі сведчыць, што гісторыя народнай адукацыі на Беларусі ў 1920—1930 гг. набывае шэраг новых цікавых аспектаў, патрабуе і далей сваей распрацоўцы на падставе прынцыпаў аб'ектыўнасці і гістарызма.

### Літаратура


1. Ільшын І.М., Умрэйка С. М. Народная асвета ў Беларускай ССР. Мн., 1957; Каменская Н. В. Становление народного образования в Белоруссии. Мн., 1980; Красовский Н. И. Высшая школа Советской Белоруссии. Мн., 1972; Нарысы гісторыі народнай адукацыі і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мн., 1968; Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917—1945 г.). Мн., 1993; Новик Е. К. Формирование кадров народного образования Белоруссии (1917—1941 г.). Мн., 1981.

2. Андрэява Е. Беларусізацыя 20-х гг. і школа // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1989. № 7; Баталка Т. Строительство белорусской национальной школы в условиях политики белорусизации: Автореф. дис. ... канд. ист. наук. Мн., 1993; Бендзін А. Ю. «Нацыянальнае адраджэнне» у вышэйшай школе Беларусі (канец 20-х — пачатак 30-х гг. XX ст.) // Нацыянальная свядомасць і выхаванне моладзі. Мн., 1996; Лыч Л. М. Беларусізацыя 20-х г. // Маладосць, 1995. № 11, 12; Тугай У. В., Ісаеў В. Ц. Беларусізацыя ў галіне Наркамасветы ў 20-я г. // Гісторыя Беларусі: Вуч. зб. дапам. Мн., 1994.

3. Яцкевіч С. Лесы адукацыі нацыянальных меншасцей на Беларусі // Весці АНМ. 1997. № 3; Ен жа. Стан адукацыі ў Заходняй Беларусі ў 1919—1941 гг. // Нацыянальная адукацыя: гісторыя, сучаснасць, перспектывы. Брэст, 1995.

4. Герасімава І. Яўрэйская вышэйшая школа ў сістэме народнай адукацыі Беларусі ў 20-я — 30-я гг. // Беларусіка. Мн., 1995. № 4; Дубянецкі Э. С. Міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў 20-я гг. XX ст.: Аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук. Мн., 1995; Пушкін І. Школы нацыянальных меншасцей БССР у 20-я — 30-я гг. XX ст. // Чалавек. Культура. Эканоміка. Мн., 1997; Шкуцько Л. Л., Герасімава І. П. Яўрэйская нацыянальная школа ў сістэме адукацыі БССР у 20-я — пачатак 30-х гг. XX ст. // Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў XX ст. Мн., 1997.





5. Евдокименко Н. Д. Проблемы становления и развития высшей школы Белоруссии (на материалах государственных и общественно-политических организаций. (1921—1932 гг.): Автореф. дис. ... канд. ист. наук. Мн., 1993.


**И. И. Синчук**

## БЕЛОРУССКИЙ БИОГРАФИЧЕСКИЙ СПРАВОЧНИК КАК ИСТОРИЧЕСКИЙ ИСТОЧНИК

Одним из неиспользуемых источников, несмотря на его доступность, полноту и корректность, является белорусский энциклопедический словарь (Белорусская ССР. Краткая энциклопедия. Т. 5. Мн., 1982). Этот специфический источник может быть полезен для таких дисциплин, как историография, филология, историческая социология. Общее количество включенных в справочник лиц превышает 4 тыс. Хронология — от времен Киевской Руси до начала 80-х гг. Справочник существует в двух языковых вариантах — русском и белорусском. В исследовании базовым является русский язык, более «освоенный» компьютером, поэтому избран русский вариант издания. Ниже показывается практически один аспект — распределение «концовок» (не обязательно совпадают с формантами) фамилий по всему справочнику безотносительно года и места рождения, что характеризует деятельность редакционной коллегии по отбору персоналий — при известных распределениях по регионам и в целом по Беларуси эти цифры столь же однозначно говорят о принципах отбора, как и отпечатки папилярных линий пальца об их владельце.

Например, нормальное распределение фамилий юго-запада Брестской области на УК/ЮК в современном Минске составляет 3%, а в среднем по Беларуси (на основе выборок из иногородних студентов минских вузов) — 4%. В справочнике таких фамилий лишь 2%, что может означать а) недостаточную социальную активность носителей таких фамилий; б) некие препятствия в достижении социально-значимых ролей; в) специфические требования к отбору кандидатов для справочника. Выявление иных подобных диспропорций (достаточно легко обнаруженных в приведенной таблице) заставляет думать об превалирующем действии последнего фактора при возможном сочетании его в разной степени со вторым и первым.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ